# АНАЛІЗ СТАНУ РЫНКУ КАНТРАФАКТНАЙ ПРАДУКЦЫІ ЕАЭС ЯК ЭЛЕМЕНТ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ БЯСПЕКІ ВА ЎМОВАХ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ

**Г. М. Уласава[1], Д. А. Белая[2]**

[1] *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, VlasavaGM@bsu.by*
[2] *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*

У нашы дні інтэлектуальная ўласнасць стала адным з ключавых элементаў міжнароднага гандлю. Галоўным паказчыкам функцыянавання эфектыўнай і збалансаванай сістэмы абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці як асобнай дзяржавы, так і Мытнага саюза з'яўляецца правапрымяняльная практыка, з дапамогай якой забяспечваецца прадухіленне і спыненне парушэнняў правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. У артыкуле разгледзены не толькі стан рынку кантрафактнай прадукцыі ЕАЭС, але і асноўныя вынікі правапрымяняльнай практыкі ў сферы правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ў дзяржавах-членах у разрэзе катэгорый парушэнняў. Для вызначэння эфектыўнасці мерапрыемстваў па спыненні распаўсюджвання кантрафактнай прадукцыі, якія рэалізуюцца ў рамках дадзенага інтэграцыйнага аб'яднання, абагульнена і прааналізавана інфармацыя ўпаўнаважаных органаў, у тым ліку Еўразійскай эканамічнай камісіі.

***Ключавыя словы:*** аб'екты інтэлектуальнай уласнасці; процідзеянне кантрафакту; Еўразійскі эканамічны саюз; эканамічная бяспека; правапрымяняльная практыка; электронны гандаль.

# АНАЛИЗ СОСТОЯНИЯ РЫНКА ПОДДЕЛОК В ЕАЭС КАК ЭЛЕМЕНТ ОБЕСПЕЧЕНИЯ ЭКОНОМИЧЕСКОЙ БЕЗОПАСНОСТИ В УСЛОВИЯХ НАУЧНО-ТЕХНИЧЕСКОГО ПРОГРЕССА

**Г. М. Власова[1], Д. А. Белая[2]**

[1] *Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, VlasavaGM@bsu.by*
[2] *Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*

В настоящее время интеллектуальная собственность стала одним из ключевых элементов международной торговли. Основным показателем функционирования эффективной и сбалансированной системы защиты прав интеллектуальной собственности как отдельного государства, так и Таможенного союза является правоприменени-

тельная практика, обеспечивающая предупреждение и пресечение нарушений прав интеллектуальной собственности. В статье рассматривается не только состояние рынка контрафактной продукции в ЕАЭС, но и основные результаты правоприменительной практики в сфере прав интеллектуальной собственности в государствах-членах по категориям нарушений. Для определения эффективности мер по пресечению распространения контрафактной продукции, реализуемых в рамках данного интеграционного объединения, обобщена и проанализирована информация уполномоченных органов, в том числе Евразийской экономической комиссии.

***Ключевые слова:*** объекты интеллектуальной собственности; противодействие подделке; Евразийский экономический союз; экономическая безопасность; правоприменительная практика; электронная коммерция.

# ANALYSIS OF THE STATE OF THE EAEU COUNTERFEIT MARKET AS AN ELEMENT OF ENSURING ECONOMIC SECURITY IN THE CONDITIONS OF SCIENTIFIC AND TECHNICAL PROGRESS

**G. M. Vlasova[1], D. A. Belaya[2]**

[1] *Belarusian State University,Niezaliežnasci Av., 4, 220030, Minsk, Belarus, VlasavaGM@bsu.by*
[2] *Belarusian State University, Niezaliežnasci Av., 4, 220030, Minsk, Belarus, belayaa_1903@mail.ru*

Nowadays, intellectual property has become one of the key elements of international trade. The main indicator of an effective and balanced system of protection of intellectual property rights of an individual state and the customs union is the law enforcement practice that prevents and suppresses violations of intellectual property rights. The article examines the principal results of law enforcement practice in the field of intellectual property rights in the EAEU member states in the context of categories of infringements. In order to determine the effectiveness of measures implemented by member states to suppress distribution of counterfeit goods in the EAEU, information of authorized bodies, including the Eurasian Economic Commission has been summarized and analyzed.

***Keywords:*** intellectual property assets; combating counterfeiting; economic security; the Eurasian Economic Union; law enforcement practice; e-commerce.

У цяперашні час галоўным аспектам як эканамічнага росту, так і збалансаванага развіцця асобных дзяржаў, мытных, эканамічных і валютных саюзаў стала карэктна арганізаваная, а, галоўнае, эфектыўная сістэма абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці (далей – АІУ). Так, напрыклад, па апошніх дадзеных Міжнароднай гандлёвай палаты і Міжнароднай асацыяцыі па таварных знаках, да 2022 года агульны эканамічны ўрон ад кантрафактнай прадукцыі дасягнуў 4,7 трлн долараў

ЗША. Ва ўмовах крызісных з'яў у эканоміцы і падзення даходаў узрастае цікавасць грамадзян да больш даступных, танных тавараў, павышаецца лаяльнасць саміх спажыўцоў да кантрафактнай прадукцыі. У кантэксце еўразійскай інтэграцыі важнае значэнне набывае выкарыстанне дзяржавамі-членамі ЕАЭС агульных падыходаў пры фарміраванні правапрымяняльнай практыкі, якая забяспечвае прадухіленне і спыненне парушэнняў правоў на аб'екты ІУ. Эфектыўная і збалансаваная сістэма абароны правоў на аб'екты ІУ у дзяржавах-членах знаходзіцца на шляху свайго станаўлення.

У Рэспубліцы Арменія за 2021 год было выяўлена ў 2,5 разы больш кантрафактнай прадукцыі ў параўнанні з папярэднім справаздачным перыядам, большую частку якой (каля 92 %) склала друкаваная прадукцыя, што была выраблена на тэрыторыі дзяржавы. Астатнія 8 % прыпадаюць на ўвезеныя аўтамабільным транспартам тавары розных катэгорый, краінамі паходжання якіх з'яўляюцца Кітай і ААЭ. Больш за тое, было здзейснена 485 прыпыненняў выпуску тавараў, у асноўным – электронікі і бытавой тэхнікі (+60 % адносна 2020 г.). Праз авіяцыйныя і аўтамабільныя перавозкі 34 % такіх тавараў прыпадае на ЗША, 19 % – на ААЭ, 10 % – на Грузію, 9 % – на Кітай [1].

У Рэспубліцы Беларусь за справаздачны перыяд мытнымі органамі выяўлена больш за 127 тыс. адзінак кантрафактнай прадукцыі, што на 5% менш за паказчык 2020 года. Больш за палову такіх тавараў склалі парфумерыя і касметыка, 22 % – абутак, астатнія 18 % – прадукты харчавання. Найбольшая колькасць парушэнняў зафіксавана пры ўвозе тавараў з Польшчы з выкарыстаннем аўтамабільнага транспарту.

У Рэспубліцы Казахстан у 2021 годзе выяўлена 10,3 тыс. адзінак кантрафактных тавараў, што амаль у 5 разоў менш за паказчык папярэдняга справаздачнага перыяду. Адным з галоўных фактараў зніжэння колькасці выяўленых мытнымі органамі парушэнняў у сферы інтэлектуальнай уласнасці (далей – ІС) і кантрафактных тавараў магла стаць уведзеная з 1 студзеня 2020 г. і працягнутая на 2021 г. забарона на правядзенне праверак суб'ектаў малога і мікрапрадпрымальніцтва для цэнтральных дзяржаўных і мясцовых выканаўчых органаў. Асноўнымі катэгорыямі кантрафактных тавараў з'яўляліся аптычныя носьбіты (33,5 %), запчасткі (24,7 %), мыйныя сродкі (14 %), што ўвозяцца з тэрыторыі КНР чыгуначным транспартам. Пэўны паток кантрафактнага тавару назіраецца таксама з тэрыторыі ЗША і Польшчы.

Акрамя таго, у Казахстане праводзіцца работа па спыненні парушэнняў у Сеціве. За 2021 год выяўлена каля 40 замежных інтэрнэт-рэсурсаў, якія распаўсюджвалі неліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне. Дадзеныя былі ўнесены ў інфармацыйную сістэму «Кібернагляд» (прызначана для

сістэматызацыі мерапрыемстваў па выяўленні, уліку ды блакіраванні супрацьпраўных матэрыялаў у Сеціве, што праводзяцца дзяржаўнымі органамі).

Колькасць выяўленых у Кыргызскай Рэспубліцы кантрафактных тавараў склала больш за 50 тыс. адзінак, большая частка якіх адносіцца да друкаванай прадукцыі, адзення і абутку, што ўвозяцца з тэрыторыі КНР, В'етнаму і Турцыі. Ролю крытычнага фактару магла сыграць рэструктурызацыя органаў дзяржаўнай улады, якая пацягнула за сабой скасаванне «фінансавай паліцыі» (Дзяржаўнай службы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі пры ўрадзе Кыргызскай Рэспублікі) [2]. Паўнамоцтвы гэтай структуры былі пераразмеркаваны паміж органамі ўнутраных спраў і пракуратуры, але пры гэтым адзначаўся разрознены характар рэалізацыі дадзеных паўнамоцтваў, у тым ліку недастатковая падрахоўка колькасці відаў адзначаных парушэнняў і адзінак выяўленай кантрафактнай прадукцыі.

У Расійскай Федэрацыі агульны аб'ём выяўленых кантрафактных тавараў склаў каля 18 млн. адзінак коштам больш за 115, 2 тыс. долараў ЗША (+34 % у параўнанні з 2020 годам) [3]. Аналіз дадзеных у разрэзе катэгорый тавараў паказаў, што значная ўдзельная вага (35 %) кантрафакту прыпадае на адзенне і абутак, а таксама на гульні і цацкі (30 %). Больш чым у палове выпадкаў краінай паходжання тавараў, якія парушаюць правы на АІУ, з'яўлялася КНР. Пэўны аб'ём увозу такіх тавараў зафіксаваны таксама з тэрыторыі Турцыі і Украіны. У 2021 годзе механізм прыпынення выпуску тавараў прымяняўся мытнымі органамі Расійскай Федэрацыі па 6,3 тыс. выпадкаў імпарту і 429 выпадкам экспарту тавараў. Тут пераважная частка рашэнняў аб прыпыненні выпуску тавараў (больш за 95 %) вынесена ў дачыненні да АІУ, якія былі ўнесены ў Мытны рэестр аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Больш за тое, было зафіксавана 5,7 тыс. выпадкаў выяўлення кантрафактнай прадукцыі ў міжнародных паштовых адпраўленнях.

Большасць мер па абароне аб'ектаў аўтарскіх правоў была прынята Федэральнай службай па наглядзе ў сферы сувязі, IT і масавых камунікацый адносна відэакантэнту (каля 79 %), літаратурных твораў (13 %), а таксама тэле- і радыётрансляцыі і музычных твораў (2 %). На іншыя катэгорыі, якія ахоўваюцца аўтарскім правам (праграмы для ЭВМ, творы навукі, мастацтва і базы дадзеных) прыйшоўся ўсяго 1 % ад агульнай колькасці. У мэтах абароны кантэнту, каля 70 % уладальнікаў інтэрнэт-сайтаў узаемадзейнічаюць з Роскомнадзорам і выдаляюць «пірацкія» матэрыялы яшчэ да блакіравання. Гэтымі механізмамі актыўна карыстаюцца і замежныя праваўладальнікі (больш за 90 выпад-

каў Маскоўскага гарадскога суда па заявах сусветных лідараў кінаіндустрыі паступіла ў Роскомнадзор ў 2021 годзе (28 ад Warner Bros. Entertainment Inc, 21 ад Universal Music, 13 ад Sony, 6 ад Disney Enterprises Inc., 4 ад Paramount Pictures Corporation) [4].

У цэлым па ЕАЭС аб'ём выяўленых кантрафактных тавараў у 2021 годзе склаў каля 18,2 млн адзінак, што на 33 % больш, чым у 2020 годзе. Тэндэнцыя на зніжэнне, якая назіралася апошнія тры гады, перапынілася праз паступовае зніманне абмежаванняў, выкліканых пандэміяй. Так, асноўнымі катэгорыямі выяўленых кантрафактных тавараў у дзяржавах-членах ЕАЭС сталі адзенне ды абутак, цацкі, парфумерыя ды касметыка, бытавыя прыборы ды інструменты, запчасткі. Улічваючы асноўныя шляхі перамяшчэння кантрафактных тавараў у Еўразійскім рэгіёне, становіцца відавочнай важнасць узмацнення мытнага кантролю за выкананнем правоў на аб’екты IУ пры ўвозе тавараў з краін Паўднёвай Азіі, Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, «традыцыйных» крыніц кантрафакту (Турцыя, Польшча і інш.).

Праз ўплыў наступстваў пандэміі COVID-19 сітуацыя стала пагаршацца, бо адбываецца пераход гандлю ў анлайн-фармат, змяненне схем распаўсюджвання кантрафактных тавараў і лагістычных ланцужкоў, таму зараз неабходна змена падыходаў да выяўлення і спынення адміністрацыйных правапарушэнняў, злачынстваў у галіне IУ, сталая распрацоўка сучасных методык барацьбы, магчыма, пашырэнне паўнамоцтваў кантралюючых органаў ды ўдасканаленне заканадаўства.

Значнае месца ў стварэнні эфектыўнага мытнага кантролю за выкананнем правоў інтэлектуальнай уласнасці, які накіраваны на выяўленне ды спыненне фактаў перамяшчэння кантрафактных тавараў, займае інстытут мытнага рэестра аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці, што дазваляе наладзіць аператыўны абмен інфармацыяй паміж мытнымі органамі і праваўладальнікамі [5]. У 2021 годзе адзначаецца павелічэнне колькасці аб'ектаў, уключаных у мытныя рэестры дзяржаў-членаў ЕАЭС: у Арменіі – на 23,4 %, у Беларусі – на 2,8 %, у Казахстане – на 13,5 %, у Кыргызстане – на 2,4 %, у Расійскай Федэрацыі – на 4,6 %.

З прычыны імклівага развіцця электроннага гандлю, у тым ліку ў дзяржавах-членах ЕАЭС (аб'ём рынку інтэрнэт-гандлю якіх павялічыўся больш чым на 40 % за апошнія два гады) і адпаведнага росту спажыўцоў, значна павышаецца таксама і ўзровень кантрафакту ў інтэрнэт-прасторы, традыцыйныя лагістычныя ланцужкі саступаюць месца інфармацыйнаму забеспячэнню паставак. Праз спрашчэнне працэдур прадпрымальніцкай дзейнасці ў электронным гандлі асцярогу выклікаюць парушэнні правоў на АIУ і аб'ём кантрафактнай прадукцыі, таму ў цяперашні час актуальнай за-

стаецца задача абароны інтэрнэт-прасторы ад распаўсюджвання кантрафакту як у асобных дзяржавах-членах ЕАЭС, так і ў рамках усяго інтэграцыйнага аб'яднання. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што адным з эфектыўных напрамкаў барацьбы з кантрафактам ў Сеціве з'яўляецца развіццё інфармацыйнага ўзаемадзеяння паміж праваўладальнікамі і органамі, якія ўпаўнаважаны на абарону правоў на АІУ, выкарыстанне сістэмы заключэння пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж інтэрнэт-платформамі і іншымі ўдзельнікамі рынку электроннага гандлю [6].

Інтэрнэт-пляцоўкі становяцца новым ды «шматабяцальным» каналам распаўсюджвання падробак. Злачынцам значна прасцей схавацца ад адказнасці ў сусветнай павуціне пад ананімным тэлефонным нумарам, а падманваць кліентаў лягчэй на адлегласці. Спажывец не можа правесці візуальны агляд тавару да моманту пакупкі, азнаёміцца з сертыфікатамі і ліцэнзіяй прадаўца [7].

Развіццё міжнароднага гандлю ў рамках ЕАЭС, з аднаго боку, ліквідуе адміністрацыйныя і фінансавыя перашкоды (у выглядзе імпартных пошлін і збораў) для павелічэння тавараабароту паміж дзяржавамі, але ж з другога боку, стварае ўмовы для паставак розных відаў кантрафактнай прадукцыі. Спецыфіка рынку кантрафакту заключаецца ў тым, што аб’ём падробленых тавараў не можа быць дакладна разлічаны, бо для атрымання такіх дадзеных неабходна правесці вялікую колькасць кантрольных закупак кожнай групы тавараў па ўсёй тэрыторыі дзяржаў-членаў Саюза, ажыццявіць экспертызу сапраўднасці набытай прадукцыі, атрымаць пацверджанне ад уладальнікаў таварных знакаў і толькі пасля гэтага вырабіць разлік. Аднак пры фарміраванні дадзеных эксперты абапіраюцца на статыстыку фальсіфікацый, што былі выяўлены праваахоўнымі органамі, колькасць судовых спраў, але ж гэтыя дадзеныя не даюць поўнай карціны, таму праводзяцца мерапрыемствы, накіраваныя на процідзеянне абароту кантрафактнай прадукцыі.

Так, органы ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь у 2020–2021 гг. прынялі ўдзел у «традыцыйных» міжнародных аперацыях «Opson 9» і «Opson 10», якія праводзіліся пад эгідай Генеральнага сакратарыята Інтэрпола і Еўрапола. У выніку выяўлена, адпаведна, 79 і 101 адміністрацыйнае правапарушэнне, звязанае з абаротам нелегальных, фальсіфікаваных і кантрафактных прадуктаў харчавання [8]. Найбольш часта выяўлялася фальсіфікаваная алкагольная і спіртазмяшчальная прадукцыя: з абароту канфіскавана больш за 35 тыс. літраў напояў коштам 235,6 тыс. долараў ЗША.

Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Казахстан пастаянна прымаецца комплекс мер, накіраваных на выяўленне і спыненне правапарушэнняў і злачынстваў, звязаных з парушэннямі аўтарскіх і сумежных

правоў. Так, у 2020 годзе пры садзеянні праграмы развіцця ААН арганізаваны ды праведзены не толькі шэраг анлайн-трэнінгаў і семінараў, але і штогадовыя прафілактычныя мерапрыемствы «Hi-Tech», «кантрафакт» і «Anti-Fraud».

Дзяржаўнай службай ІУ і інавацый пры ўрадзе Кыргызскай Рэспублікі на сістэматычнай аснове праводзяцца лекцыі і вэбінары для інфармацыйнага прасоўвання пытанняў прадастаўлення прававой аховы і абароны правоў на АІУ. У 2020 годзе праведзена 10 анлайн навучальных курсаў па пытаннях у сферы ІУ, якія былі разлічаны на розную мэтавую аўдыторыю. Для падтрымкі і развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці быў створаны Цэнтр абслугоўвання прадпрымальнікаў, які выступае ў якасці адзінай пляцоўкі па прадастаўленні паслуг і ажыццяўленню іншых формаў узаемадзеяння паміж дзяржаўнымі органамі і органамі мясцовага самакіравання, суб'ектамі прадпрымальніцтва і крэдытна-фінансавымі ўстановамі [9]. Вядуцца распрацоўкі інфармацыйна-пошукавай сістэмы па АІУ, што ўнесены ў Мытны рэестр, які дазваляе мінімізаваць час на пошук пэўнага таварнага знака супрацоўнікамі мытных органаў і ўдзельнікамі знешнеэканамічнай дзейнасці.

У Расійскай Федэрацыі дзеля аўтаматызацыі працэсаў, звязаных з абаронай мытнымі органамі правоў на АІУ, праводзіцца дапрацоўка праграмных сродкаў адзінай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы мытных органаў у частцы вядзення мытнага рэестра АІУ у электронным выглядзе і забеспячэння інфармацыйнага абмену паміж Федэральнай мытнай службай і Галоўным мытным кіраваннем КНР звесткамі пра кантрафактныя тавары праз абароненыя каналы сувязі. У мэтах развіцця мытных інфармацыйных рэсурсаў, у Стратэгію развіцця мытнай службы Расійскай Федэрацыі да 2030 года і ў Ведамасную праграму лічбавай трансфармацыі ФМС Расіі на 2021–2024 гады ўключаны мерапрыемствы, накіраваныя на забеспячэнне аўтаматычнай рэгістрацыі АІУ у мытным рэестры і аўтаматычнага кантролю захавання правоў ІУ пры мытным дэклараванні тавараў. Ажыццяўлялася супрацоўніцтва з мытнымі адміністрацыямі дзяржаў-партнёраў, было праведзена аператыўна-прафілактычнае мерапрыемства «кантрафакт» для спынення фактаў вырабу і абароту фальсіфікаванай і незаконна ўвезенай прадукцыі.

ЕАЭС удзельнічае ў распрацоўцы мерапрыемстваў па процідзеянні абароту кантрафактнай прадукцыі ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў пад кіраўніцтвам Бюро па каардынацыі барацьбы з арганізаванай злачыннасцю і небяспечнымі відамі злачынстваў на тэрыторыі СНД [10]. Мытныя органы дзяржаў-членаў прынялі ўдзел у найбуйнейшай глабальнай аперацыі па барацьбе з незаконным гандлем лекамі, вакцынамі і медыцынскімі прыладамі, звязанымі з COVID-19, якая праводзілася Сусветнай

мытнай арганізацыяй у 2021 годзе. У аперацыі ўдзельнічалі 146 мытных адміністрацый і прадстаўнікі разнастайных міжнародных арганізацый (Еўрапол, Інтэрпол, Еўрапейскае бюро па барацьбе з махлярствам, Упраўленне ААН па наркотыках і злачыннасці, Сусветная арганізацыя аховы здароўя). Аперацыя «STOP» 2021 года стала працягам аналагічнай аперацыі папярэдняга года, аднак па яе выніках было канфіскавана ў два разы больш кантрафактнай прадукцыі.

Такім чынам, дзяржавам-членам ЕАЭС неабходна працягваць работу па выпрацоўцы зладжаных падыходаў у сферы барацьбы з парушэннямі правоў на АІУ у Сеціве з наступным іх замацаваннем у праве ЕАЭС; павялічыць колькасць мерапрыемстваў для ўзмацнення грамадскага кантролю ды павышэння інфарміраванасці грамадства; паскорыць правядзенне работ па забеспячэнні рэалізацыі агульнага працэсу фарміравання, вядзення і выкарыстання адзінага мытнага рэестра АІУ дзяржаўчленаў у нацыянальных сегментах; удасканальваць правапрымяняльную практыку ў сферы абароны правоў на АІУ.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2021 год г. Москва, 2022 г. [Электронный ресурс]. URL: https://eec.eaeunion.org/upload/media library/911/Otchet-PPP-za-2021-god_FINISH.pdf. (дата обращения: 24.03.2023).
2. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2021 год г. Москва, 2022 г. [Электронный ресурс]. URL: https://eec.eaeunion.org/upload/media library/911/Otchet-PPP-za-2021-god_FINISH.pdf. (дата обращения: 24.03.2023).
3. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2021 год г. Москва, 2022 г. [Электронный ресурс]. URL: https://eec.eaeunion.org/upload/media library/911/Otchet-PPP-za-2021-god_FINISH.pdf. (дата обращения: 24.03.2023).
4. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2021 год г. Москва, 2022 г. [Электронный ресурс]. URL: https://eec.eaeunion.org/upload/media library/911/Otchet-PPP-za-2021-god_FINISH.pdf. (дата обращения: 24.03.2023).
5. *Леанович Е. Б.* Международная охрана интеллектуальной собственности на современном этапе глобализации: монография. Saarbrucken: LAB publishing, 2011. 95 с.
6. Направления совершенствования таможенной защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в рамках ЕАЭС [Электронный ресурс]. URL: http://ipcmagazine.ru/legal-issues/directions-for-improving-customs-protecti on-of-intellectual-property-rights-within-the-eaeu. (дата обращения: 22.03.2023).
7. О Стратегических направлениях развития евразийской экономической интегра– ции до 2025 года: Решение Высшего Евразийского экономического совета, 11 декабря 2020 г., № 12 // Нац. правовой Интернет-портал Рес. Беларусь. Минск, 2021. 61 с.

8. Operation Opson IX – Analysis report [Электронный ресурс]. URL: https://www.europol.europa.eu/publications-events/publications/operation-opson-ix-%E2%80%93-analysis-report. (дата обращения: 22.03.2023).

9. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2021 год г. Москва, 2022 г. [Электронный ресурс]. URL: https://eec.eaeunion.org/upload/media library/911/Otchet-PPP-za-2021-god_FINISH.pdf. (дата обращения: 24.03.2023).

10. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2021 год г. Москва, 2022 г. [Электронный ресурс]. URL: https://eec.eaeunion.org/upload/media library/911/Otchet-PPP-za-2021-god_FINISH.pdf. (дата обращения: 24.03.2023).